Грамадскае незалежнае выданне, выходзіць са студзеня 1997 года

Газета для вас

12-18 верасня 1998 года
№ 63 (143)
Наш індэкс 63834

Цана па падпісцы — 2000 руб.
Цана ў розніцу — 2000 руб.

ІВАЦЭВІЧЫ -БАРАНАВІЧЫ -БЯРОЗА

ІВАЦЭВІЧЫ

Памятны знак Касцюшку ўсё ж з'явіцца

Пра гэта наша газета неаднаразова пісала. 300 мільёнаў рублёў пералічана з бюджэту Брэсцкай вобласці для фінансавання работ па ўстаноўцы мемарыяльнага знака.

У пачатку года Брэсцкі аблвыканкам прыняў рашэнне аб устаноўцы такога знака да 1 жніўня. Аднак з-за адсутнасці сродкаў да гэтай даты была гатовая толькі памятная дошка. Тэкст на ёй ужо ўзгоднены. Вось ён: "Тут, ва ўрочышчы Марачоўшчына, нарадзіўся Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, вялікі сын беларускай зямлі, які ў далейшым стаў нацыянальным героем Польшчы, Злучаных Штатаў Амерыкі, ганаровым грамадзянінам Францыі. Удзячныя нашчадкі Брэстчыны. 1998 г."

Мемарыяльны знак і памятную дошку з названым тэкстам мяркуецца ўстанавіць сёлета.

Засталося толькі памерці...

З неверагоднай хуткасцю "засяліліся" могілкі райцэнтра, размешчаныя гадоў пятнаццаць таму ў ляску за вёскай Панкі. Цяпер тут засталося не так ужо і шмат свабоднага месца. "Спрыяе" гэтаму смяротнасць (якая значна перавышае нараджальнасць), выкліканая і сацыяльна-эканамічнымі, і экалагічнымі ўмовамі жыцця гараджан.

Да таго ж многія людзі пачалі абгароджваць магілы родных нябожчыкаў, пакідаючы месца на ўласнае пахаванне. Да гэтага, мабыць, іх заахвоціла ініцыятыва спецслужбы РВА ЖКГ, якая прапанавала пенсіянерам загадзя, пры жыцці, клапаціцца пра месца на могілках. І якім бы святым і трагічным месцам не з'яўляліся могілкі, без кур'ёзаў яно не засталося. Многія наведвальнікі могілак цяпер пры выпадку наведваюць магілу, на якой пастаўлены помнік мужу з жонкай. Усё на ім як мае быць: фотаздымак сямейнай пары, словы "Помним, любим, скорбим" ад дзяцей і ўнукаў. Вось толькі даты смерці мужа няма. Аказваецца, ён яшчэ жывы і здаровы, можа выконваць нават нялёгкую работу па пасадцы і капанні бульбы. А помнік, пад якім пахавана жонка, проста яго чакае...

Хто з'явіўся ініцыятарам гэтай эканоміі (відаць, не ад салодкага жыцця!), мы не сталі высвятляць. Толькі бярэ за душу жуда, калі глядзіш на помнік жывому чалавеку. Трэба было добра прыціснуць цярплівых і абачлівых беларусаў, каб прымусіць іх эканоміць на пахаванні...

Их ведут организаторы

7 сентября в Ивацевичском Доме детского творчества состоялся семинар на тему "Планирование работы педагогов-организаторов и пионерской дружины".

Воспитать детей гуманными, добрыми, ответственными за порученную им работу — вот основные задачи, которые ставят перед собой педагоги-организаторы. Важно ознакомить детей с уставом пионерской дружины, законом РБ "О правах ребенка". А главное — создать в школе активную среду, где каждый ученик сможет проявить себя.

На семинаре выступили педагоги-организаторы Гощевской, Добромысельской, Домановской и других школ. Среди других обсуждался вопрос о праздновании 13 сентября Дня рождения Белорусской республиканской пионерской организации. В этот день во всех школах района будет дан старт новым, интересным делам пионерских дружин.

Среди педагогов-организаторов были те, кто только начинает работать, и те, кто проработал уже много лет.

Свою трудовую деятельность на новой должности начинает Марина Шклярик (Погорская школа). Она сказала:

— Мне нравится работать с детьми. Они умеют радоваться. Такие светлые мысли у них...

Валентина Уваркина давно работает в СШ № 3 г. Ивацевичи:

— Я не представляю себя без этой работы. И несмотря на то, что материального стимулирования практически нет, всегда стараюсь выполнить работу на "5", а если меньше, переделать на "отлично"...

Інфармацыйны выпуск "Навіны: час мясцовы" падрыхтавалі: Л. ЦАЛУЙКА, С. КАЖАДУБ, студэнтка-практыкантка БДУ Н. КАПЫЦІЧ (Івацэвічы), С. РУСЕЦКІ, М. СІНКЕВІЧ (Бяроза), А. ЛАЎРАНЮК (Баранавічы) і фотакарэспандэнт А. ГАНЧУК.

НАВІНЫ: ЧАС МЯСЦОВЫ

БЯРОЗА

Аднаўляючы савецкія традыцыі

У лепшых савецкіх традыцыях працаўнікі дзяржаўнага вытворчага прадпрыемства "Бярозабудматэрыялы" па загаду генеральнага дырэктара Басалая абавязаны адпрацаваць як мінімум адзін дзень на сельгасработах у калгасе "Лясковічы", які ўваходзіць у аб'яднанне.

XXX

Да свята "Дажынкі-98" у Бярозе дзеля паказухі перафарбавалі фасадны бок будынкаў і агароджаў вуліцы Леніна, аднак усе недахопы ў дварах нават гэтай вуліцы засталіся, не гаворачы ўжо пра ўсе астатнія. Жыхарка з вуліцы Гарына-Каляды прыйшла ў раённае ўпраўленне жыллёвай гаспадаркі з патрабаваннем рамонту даху пяціпавярховага дома, у якім яна жыве. Справа ў тым, што гэты дах ужо на працягу некалькіх гадоў падчас дажджоў нагадвае рэшата. Ніякія тазікі і вёдры не выратоўваюць. Калі дапамога не будзе аказана, то жанчына гразілася на дажынках запрасіць усіх журналістаў да сябе ў госці.

"Несмяротная" лужа

Завяршылася падрыхтоўка да святкавання абласных дажынак. Асабліва пашчасціла цэнтральнай вуліцы Леніна: пафарбаваныя дамы, узведзены чыгунчныя агароджы, заасфальтаваны тратуары. Але аднаго не заўважылі рамонтнікі — вялікай лужы, якая знаходзіцца ў месцы выхаду з малога рынка на плошчу Леніна. Яна не перасыхае нават у сонечнае надвор'е, а пасля дажджу зайсці з гэтага боку на рынак ці выйсці з яго ўвогуле цяжка. Маладыя ды спрытныя яшчэ неяк пераскочаць ці пройдуць па бардзюры, чапляючыся рукамі за сцяну. А што рабіць пажылым, хворым ці кабетам з малымі дзецьмі? Другі выхад з рынка, ля музея, таксама мае значны недахоп — высокі парог, які цяжка пераадольваць старым людзям. Зімой ён абмярзае лёдам і наогул робіцца небяспечным для здароўя. Хацелася б, каб рамонтнікі ўсё ж такі заўважылі і зліквідавалі гэтыя недахопы: і працы нямнога, і карысць вялікая, і людзі "дзякуй" скажуць.

БАРАНАВІЧЫ

Цяжка ў вучэнні...

Пачаліся камандна-штабныя вучэнні з 28-м армейскім корпусам. На Абуз-Лясноўскі палігон прыбыла вялікая група генералаў і афіцэраў, 90 адзінак бранятанкавай і 500 адзінак аўтамабільнай тэхнікі. Камандуе вучэннямі сам міністр — генерал-палкоўнік Аляксандр Чумакоў.

КОНКУРС "САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"

АЛИНА. По гороскопу — Рыбы. Мой любимый певец — Стинг, а среди актеров — Леонардо Ди Каприо. Считаю себя прогрессивной девушкой. Люблю хорошо одеваться, рассматривать журнал мод. Думаю, что мужчина должен быть не только денежным человеком, но и немножко романтиком.

КУКУРУЗНЫХ ПАЛАЧАК ХАПАЕ...

Тое, што адбываецца на рынках Івацэвіч, Баранавіч, Бярозы, можа прысніцца толькі ў страшным сне.

Цэны на тавары, курс долара, не падпарадкоўваючыся загадам кіраўніцтва дзяржавы, імкліва панесліся ўгору.

Тое, з якой хуткасцю расце зараз кошт на цукар і алей, наводзіць жах: калі з месяц таму кілаграм салодкага прадукта каштаваў 30.000 на рынку і 28.000 у крамах, алей — 90.000 і 84.000 за літр адпаведна, то зараз цукар каштуе на рынку 48.000, а алей — 140.000.

Зразумела, што на паліцах магазінаў гэтыя тавары, мякка кажучы, не назіраюцца.

З продажу перыядычна знікае мука, рэзка знізіўся асартымент макаронаў і асабліва крупы. Праўда, кукурузных палачак пакуль хапае. Своеасаблівая адметнасць сенняшняга крызісу: насельніцтва больш "налегае" на харчовыя запасы. Напрыклад, гарэлка, якую звычайна ў такія крызісныя часы людзі ахвотна скупалі пра запас, асаблівым попытам не карыстаецца. Можа, да пары да часу?

Пусцеюць і мэблевыя магазіны. У краме па вуліцы В. Клютка ў Івацэвічах імгненна разышліся прыхожыя, кухні, сценкі, на якія месяцамі ніхто не звяртаў увагі. Няма ў продажы і халадзільнікаў.

У сувязі з узрастаннем курса долара, рэзка ўзраслі ў цане кошты парфумерыі, пральных парашкоў, шакаладу і г. д. Напрыклад, кошт шакаладкі "Альпен гольд" на рынках пераскочыў з 25000 да 45000 рублёў. Сам жа долар трывала трымаецца ў межах 110 тысяч рублёў.

Цяперашні крызіс яшчэ адметны тым, што ўлада чамусьці не звяртае на яго ранейшай увагі. Калі ў красавіку долар падскочыў на 10000 рублёў, то "паляцелі" са сваіх пасад старшыня Нацбанка і іншыя службовыя асобы. Зараз долар падняўся на 50% — і ніякіх эмоцый, акрамя нейкага службовага марнытання і запэўнівання, што ў нас усё нармальна. Ці не таму, што сенняшнія ўлады павінны, як унтэрафіцэрская ўдава, за тое, што нарабілі, самі сябе высякчы. Цікава, што гаворачы пра фінансавы крызіс у Расіі, нашы высокія кіраўнікі нічога не гавораць пра свае адносіны са "старшым братам", пра тое, што наша эканоміка непарыўна прывязана і зарыентавана толькі на расійскую. Сённяшняя сітуацыя яскрава дэманструе цану нашага суверэнітэту. А мо не трэба Расіі заглядваць у рот і рваць сувязі з Захадам, спадзяючыся толькі на "старэйшага брата", які ў сваёй хаце не можа, як гаворыцца, разабрацца і навесці парадак?

А. ГОРБАЧ.

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ! ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З "ГАЗЕТАЙ ДЛЯ ВАС". ДА ЗАКАНЧЭННЯ ПАДПІСКІ НА IV КВАРТАЛ — 2 ТЫДНІ!

НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ

Новыя мадэлі тэлевізараў

У беларускіх крамах з'явіліся пяць новых мадэляў каляровых тэлевізараў, распрацаваных і выробленых на вытворчым аб'яднанні "Гарызонт".

Пры вырабе выкарыстаны камплектуючыя сусветна вядомых фірм "Філіпс", "Сіменс", "Томсан", "Самсунг", "Панасонік", якія забяспечваюць высокакантрастную, яркую і якасную выяву. На думку спецыялістаў аб'яднання, тэлевізары "Гарызонт" па якасці ні ў чым не ўступаюць аналагічнай прадукцыі вядомых замежных фірм. Адначасова яны ў 1,5-2 разы таннейшыя за імпартныя аналагі.

Калі ўлады не прыслухоўваюцца да голасу працоўных...

Як вядома, свае патрабаванні да ўрада па "карэкціроўцы сацыяльна-эканамічнага курса ў інтарэсах працоўных" прафсаюзы і шэраг працоўных калектываў выклалі яшчэ ў маі на рэспубліканскім сходзе.

Але, як паведамілі ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дагэтуль "ні адну з пазіцый рэзалюцыі сходу ў поўным аб'ёме ўлады не выканалі". Працоўная сіла, адзначылі ў ФБР, абясцэнілася да "крытычнага ўзроўню". Аплата працы ў Беларусі ніжэй, чым ва ўсіх суседніх дзяржавах. І нават гэты мізер не выплачваюць. Пры штомесячным росце цэн запазычанасць па выплаце заробкаў на 25 ліпеня склала 1 трыльён 704,4 мільярда рублёў. За паўгоддзе нявыплаты ўзраслі ў два разы. Цяжэй за ўсё, як вядома, сітуацыя ў сельскіх гаспадарках. У многіх з іх заробак не выплачваюць за тры, чатыры і больш месяцаў.

Дата правядзення акцыі пратэсту будзе вызначана на наступным пасяджэнні прэзідыума ФПБ, якое запланавана на сярэдзіну верасня.

Праявілі салідарнасць

Лідэры міжнароднай арганізацыі "Хрысціянска-дэмакратычны Інтэрнацыянал" гатовыя распачаць кампанію салідарнасці з дэпутатамі Вярхоўнага Савета Беларусі Андрэем Клімавым і Уладзімірам Кудзінавым, выкарыстоўваючы для гэтага фракцыі ў нацыянальных парламентах і міжпарламенцкіх арганізацыях.

Аб гэтым было заяўлена на прайшоўшай у Санкт-Пецярбургу канферэнцыі "Хрысціянска-дэмакратычныя і кансерватыўныя партыі ў СНД", у якой удзельнічалі 100 палітыкаў з 20 дзяржаў. У ліку прадстаўнікоў Беларусі прысутнічалі кіраўнікі Аб'яднанай грамадскай партыі С. Багданкевіч і А. Лябедзька.

Сярод дакументаў, прынятых на канферэнцыі, — заява аб сітуацыі ў Беларусі. У ёй выказаны пратэст супраць існуючага ў рэспубліцы татальнага кантролю выканаўчай улады над СМІ, асуджаюцца дзеянні беларускіх уладаў у дачыненні да заходніх дыпламатаў і выкарыстанне насілля супраць дэпутатаў Вярхоўнага Савета.

Дарагая наша пошта

З 4 верасня зноў падняліся кошты перасылкі пошты за межы Беларусі

Цяпер за звычайны ліст, дасланы ў краіны СНД, трэба заплаціць 4.600 рублёў, за заказны — 7.000 рублёў. Авіятарыф складае 5.500 рублёў за простае пісьмо і 7.900 за заказное. Дарэчы, практыка паказвае, што розніцы ў тэрмінах дастаўкі лістоў у краіны СНД па зямлі і паветраным шляхам практычна няма ніякай.

З 1 верасня падаражэлі і тэлефонныя перамовы з краінамі СНД. Танней за ўсё каштуе хвіліна размовы з Украінай — 10.300 рублёў за хвіліну. За перамовы з еўрапейскай часткай Расіі вам давядзецца заплаціць 13.900 рублёў за хвіліну, а з азіяцкай — ужо 14.600. Кошт размоваў з Малдовай — 13.900 рублёў за хвіліну. Даражэй за ўсё размаўляць з краінамі Цэнтральнай Азіі і Каўказа. Хвіліна размовы з Арменіяй, Грузіяй, Казахстанам і Кыргызстанам каштуе цяпер 18.200 рублёў, а з Азербайджанам, Таджыкістанам, Туркменістанам і Узбекістанам — 20.800 рублёў. Кошты перамоваў з краінамі Балтыі і астатнім светам пакуль не змяніліся.

Дзень беларускага пісьменства і друку

У знакамітым, багатым на гістарычныя падзеі горадзе Орша прайшоў Дзень беларускага пісьменства і друку.

Сёння на Беларусі працуюць 10 дзяржаўных выдавецтваў, зарэгістравана больш чым 100 прыватных, выходзіць каля 1000 перыядычных выданняў. У першым паўгоддзі ў рэспубліцы выдадзена 425 найменняў беларускамоўных кніг; 168 з іх убачылі свет дзякуючы дзяржаўным выдавецтвам.

На свяце афіцыйна абвешчана, што наступным месцам святкавання стане не меней знакаміты Пінск.

(Па старонках рэспубліканскіх газет).

"Битва за урожай": взгляд изнутри

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Каждая вторая половина лета в последние годы отличается от первой истерическими заклинаниями, призывами к труженикам колхозов и совхозов. Ловкое перо фельетониста уже успело притупиться, и на эту, навязшую в зубах тему, смотрят сегодня как на неизбежное: как на снег или ветер.

Эта пора года отличается еще более чем активным подпеванием хора зазывал: от местечковых "районок" до государственных мужей, сигающих по колхозным "палетках" на государственных "Волгах".

Но любой средний школьник, не то что бывший председатель колхоза, вам растолкует, что у нормального хозяина "битва за урожай" начинается вообще-то не в конце июля, а идет в течение всего года: когда удобряются поля, классифицируются семена, вносятся гербициды, проводятся химпрополки и так далее. Что убирать (а не биться) урожай еще не проблема, вырастить — вот вопрос.

И почему-то вспоминается мрачная картинка военного времени: продвижение по окопах разрешено неспешным шагом, в атаку — под пули и на смерть — бегом. Сравнение с нашими "битвами", конечно, условное, да вот скорости те. Быстрее! Убрать в срок! Без опозданий! Чтобы не думал работник о том, что работает почти задаром. Чтобы забыл о том, что зарплата не плачена еще за май, а за эту "битву" заплатят бог знает когда. Что помыться комбайнеру негде: бани-то в основном не работают. Что кончится "битва" словесными благодарностями, одним телевизором одному из тысяч да вывешиванием щитов и плакатов вроде "Слава комбайнеру", "Слава трудовому классу". Уж за что-что, а за плакаты и грамоты можно ручаться. Да, славы много воздадут комбайнеру. Выручка, премии, квартальные пойдут в другом направлении.

...Головы гордые согнутся,
Навалят на спины кули.
И в желтых окнах засмеются,
Что этих нищих провели.

Сегодня, правда, уже никто не смеется, глядя на согбенные спины крестьян. Политические деятели — сплошь и рядом артисты, умеющие патетически прижимать руки к сердцу да сентиментальными заклинаниями вышибать слезу у сердобольного крестьянина.

Хотя "битва за урожай", как говорит военным слогом наш всенароднолюбимый Президент, — защита суверенитета, стратегическая оборона государства. Но противоречие этих слов режет слух: почему ж в таком случае не назначить зарплату комбайнерам как генералам генштаба. Только наивный не догадается, что в таком случае "битва" кончится мгновенно. Не за месяц — за неделю уберет село хлеб в колхозные амбары, как убирает активно свой второй хлеб, как собирает заезжим коммерсантам чернику. Тогда-то "битва за урожай" закончится, а начнется просто уборка. Правда, куда деваться и что делать армии указчиков, подпевал и прихлебателей, смотрящих из "желтых окон" на "этих нищих"?

А. МИХАЛЕНКО.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА ПУБЛІКАЦЫІ "АДМІНІСТРАЦЫІ НЕ ДА ТРАЎМІРАВАНЫХ?" ("ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС" № 58)

Для зручнасці інвалідаў?..

У маленькай заметцы «Адміністрацыі не да траўміраваных?» жыхар г. Івацэвічы В. Лаўроўскі звяртаўся да адміністрацыі Івацэвіцкага РТМА з просьбай-прапановай аб перамяшчэнні траўматалагічнага кабінета з другога паверха бальніцы на першы. "...Няўжо адміністрацыя бальніцы не разумее, — пісаў ён, — што чалавеку з пераломам нагі на другі паверх узабрацца ўсё роўна, што ісці на Эльбрус?»

Мы атрымалі на гэту публікацыю адказ намесніка галоўнага ўрача РТМА па амбулаторна-паліклінічнай рабоце М. А. Лукашэвіч, у якім яна піша:

— Вопрос, поднятый жителем г. Ивацевичи В. Лавровским в «Газете для вас» от 8-14.08.98 года, для администрации РТМО не новый, не безразличный, а болезненный.

Размещение травматологического кабинета с самого начала строительства Ивацевичской поликлиники предусмотрено на II-м этаже, что, естественно, при отсутствии лифта неправильно. Последние годы администрацией неоднократно прорабатывались варианты перевода травматологического кабинета на I этаж. Однако это невозможно, так как перемещению подлежит весь блок: хирургический кабинет, перевязочная и травматологический кабинет – они технологически не разделены. Основное требование этих кабинетов — соответствие требованиям санитарно-эпидемиологического режима. Ни в одном из существующих кабинетов I этажа создать необходимые условия для работы травматологического кабинета нет; все они маленькие по площади.

Чтобы выйти из этого положения, необходимо строительство новой поликлиники, нового больничного корпуса.

Что же касается кабинетов администрации на I этаже, то вся администрация расположена на III-м этаже. На I-м же только кабинет заместителя по медреабилитации (она же – председатель медико-реабилитационной экспертной комиссии), где устанавливается группа инвалидности. Согласитесь, по этой же причине, что и в травматологический кабинет, подниматься на II-III этаж инвалидам тоже тяжело. Только для удобства инвалидов кабинет этого заместителя специально расположен на I-ом этаже.

М. А. Лукашевич,
зам. главврача РТМО
по амбулаторно-поликлинической работе.

ХХХ

Даўно заўважана: хто хоча працаваць – той знаходзіць выйсце, хто не хоча — знаходзіць прычыны. Як вынікае з адказу М. А. Лукашэвіч, адміністрацыя бальніцы гадамі (!) неаднаразова прапрацоўвала варыянты пераводу траўматалагічнага кабінета на першы паверх. І – безвынікова! Бо, каб зрабіць гэта, неабходна новую паліклініку пабудаваць. Не больш і не менш. І не трэба каму ўздумаецца лічыць кабінеты на першым паверсе бальніцы, высвятляць, хто іх займае, бо адміністрацыя займае толькі адзін і то дзеля зручнасці інвалідаў...

Такім чынам, В. Лаўроўскаму і ўсім патэнцыяльным прэтэндэнтам на ідэю пераводу траўматалагічнага кабінета на першы паверх бальніцы даецца, як гаворыцца, добры адлуп. Будзеце, як бы гэта мякчэй сказаць, і далей на адной ножцы на другі паверх скакаць! Бо ўсім зразумела, што на будаўніцтва новай паліклінікі ў сённяшніх умовах глыбокага эканамічнага крызісу надзеі слабыя. Вось толькі з тымі кабінетамі на першым паверсе нейкая няўвязка атрымліваецца. Мо забыла адміністрацыя РТМА, што, акрамя кабінета намесніка галоўнага ўрача па медрэабілітацыі, тут размешчаны аптэка, цырульня, кабінет псіхалагічнай разгрузкі, а таксама кабінет старшай медсястры МРЭК і загадчыцы аддзялення медыцынскай рэабілітацыі?

Памёр кіраўнік уніятаў

2 верасня ў шпіталі памёр кіраўнік дэканата Беларускай грэка-каталіцкай царквы айцец Ян Матусевіч.

Ён нарадзіўся ў 1948 г. у Мінску і пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута прыняў сан праваслаўнага святара. Да 1979 г. айцец Матусевіч быў настаяцелем некалькіх праваслаўных прыходаў Расіі і Беларусі, паралельна ён вучыўся ў семінарыі горада Сергіеў Пасад пад Масквою.

Перайшоўшы ў каталіцтва, айцец Матусевіч дзесяць гадоў кіраваў парафіяй у мястэчку Баруны Ашмянскага раёна, а ў пачатку 90-х ён узначаліў рух па адраджэнні Беларускай грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы. З 1991 г. а. Ян Матусевіч стаў фактычным кіраўніком гэтай царквы ў Беларусі.

Айцец Матусевіч быў вядомы не толькі як рэлігійны, але і грамадскі дзеяч. Ён браў удзел у першым з'ездзе БНФ, уваходзіў у кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы і іншых грамадскіх арганізацыяў. Многія памятаюць, як а. Матусевіч асвячаў усталяваны ў Курапатах крыж памяці ахвяраў бальшавізму і абраз Маці Божай Чарнобыльскай работы вядомага беларускага мастака Аляксея Марачкіна.

ВАШЕ ПИСЬМО

Было бы желание...

Уважаемая редакция "Газеты для вас"!

Я — частный предприниматель, хочу заниматься продажей свежей рыбы. Хотел бы узнать через вашу газету, продаёт ли белоозерский рыбхоз свежую рыбу мелким оптом. Если "да", то хотелось бы знать подробности: по какой цене, в каком количестве. Если вам нетрудно, то сообщите какой-либо номер телефона рыбхоза, по которому можно получить справку.

Г. ЛЕВЧУК,
ст. Доманово.

ХХХ

Внештатные корреспонденты "Газеты для вас" по Березовскому району связались с заместителем директора рыбхоза "Селец" Юрием Михайловичем Баженовым. По его словам, сотрудничество с предпринимателями, которые будут забирать у них рыбу оптом (в любом количестве), они только приветствуют. Нужно приехать в рыбхоз и заключить договор об этом сотрудничестве (т. е. оговорить условия поставки рыбы: график, транспорт и т. д.).

С 8 сентября в рыбхозе началась путина. Производится отлов рыбы разных видов: карпа, карася, щуки, пестрого толстолобика, белого амура, плотвы. Цена, естественно, разная. Телефон зам. директора рыбхоза Ю. М. Баженова 8-243-67-2-31.

Таким образом, уважаемый Г. Левчук, вас ждут в рыбхозе. "Газета для вас" желает Вам успехов!

СКВОЗЬ ТЕРНИИ — В РЫНОК

Ловушка для покупателей

Где тот тайный центр подпольного управления нашим государством с почти не управляемым социалистическим рынком? Кто заваривает ценовую кашу, сводящую с ума простого, не искушенного в маркетинге, доверчивого покупателя? Некое секретное сообщество «деловых людей». Или эти несуразности рыночные – результат неумелого управления «рыночными, плановыми отношениями»? Тьфу, ты. Язык сломаешь, пока выговоришь, а уж в суть, противоположных по значению и объединенных названием экономических понятий и вовсе вникнуть не каждому дано.

А вдруг нет никакой теневой экономики, мафии и т. д. Может, просто по безалаберности и личному безразличию работников госторговли в Ивацевичах как-то нельзя было купить и одного килограмма сахара, 9% уксуса, а магазины и частные палатки в Барановичах были завалены этими продуктами. Здесь же весной чуть ли не по домам развозили цыплят, навязывая их людям, а опять же в Ивацевичах не слышно было и писку цыплячьего.

Колбаса пока есть — потому что дорогая.

То, что наш колосс – потребкооперация – до сих пор не только не перестроилась, но и еще и не начинала перестройку, известно всем. Более того, лет этак 15-20 назад горожане ездили в глубинку за дефицитными вещами. Теперь сельчанин довольствуется тем, что привезут в местный магазин. Колбасу по 200 т. р. он не возьмет. Хлеб иногда застанет. Сигареты... Новая рыночная баталия. Что тут скажешь, привык сельский труженик к «Астре», «Приме», «Памиру». По карману с его мизерным заработком и – за горло дерет. 40-тысячная пачка «Мальборо» не про него. В последнее время кто-то опять дернул за рычаги и исчезли эти недорогие сигареты. Изредка, правда, появляются. Но все дороже и дороже. Играет этот «кто-то» на пагубной страсти курильщика. Тянет цену вверх.

Между тем, есть для каждого магазина обязательный ассортимент товаров на продажу. Кто его соблюдает? Безответственная стала кооперативная (считай – государственная) торговля перед сельским покупателем. Да и городским – тоже. Найдите хотя бы один районный потребительский союз, работающий без долгов. А торговые палатки, облепившие его нерентабельные магазины, процветают. Иначе не торговали бы. Так нужен ли такой бессильный, неразворотливый колосс на шее сельчанина, выжизающий за счет паевых взносов, но не обеспечивая людей предметами и продуктами первой необходимости? Только и накопил он опыта, как ставить ловушки для покупателей с целью одурачить, затуманить мозги и поднять цену на товар.

Очевидно, нет ни подпольного центра, ни тайного сообщества. А есть гигант на глиняных ногах, который государство упорно поддерживает. Зачем? Ради демонстрации «плановой, рыночной экономики». Каковой, насколько известно, в мире нет. Умерла, как случайный зигзаг социалистической экономики. Реанимации не подлежит.

Черви по-американски

«Газета для вас» в прошлом году опубликовала статью «Калифорнийские черви» — о необычном способе производства высокоэффективных органических удобрений. Красные черви, выведенные калифорнийскими селекционерами, перерабатывают навоз, бытовые пищевые отходы, гнилые овощи в прекрасный гумус, дающий прибавку в урожае в 20-50 процентов.

Червиную ферму организовали в Барановичах два друга Владимир Земоглядчук и Виктор Потоцкий. В пустующих помещениях здания теплицы комбината железобетонных конструкций они развели уже до нескольких миллионов червей, произвели несколько тонн гумуса. Охотников на эту продукцию было мало. Новинка, одним словом. Мало ли что...

Между тем на «родине» червей – в США это дело поставлено широко и основательно. Специалисты считают удобрения от красных червей самыми «калорийными» для растений, экологически чистыми. Созданы целые фермы, фабрики гумуса. Накоплен опыт. Им недавно поделился с барановичскими фермерами американский гражданин, житель штата Флорида Ларри Мартин. Он откликнулся на приглашение всех белорусских энтузиастов по разведению червей и лично посетил участок Земоглядчука и Потоцкого. Подсказал, как повысить плодовитость червей, лучше сбалансировать их питание. Основная их ценность – необыкновенная прожорливость и всеядность, значит, и высокая производительность гумуса.

По словам Ларри Мартина, в Америке уже десятки тысяч людей разводят этих червей и используют гумус на своих участках. Дело ведь не сложное. Приобрел сотню-две особей, получил бесплатную консультацию, поселил их в обычный деревянный ящик. Через годдва при правильном содержании черви обеспечат, скажем, дачный участок удобрением. Да каким: 150-200 граммов гумуса вносите на 1 кв. м. земли. И три года не надо никаких добавок: ни органических, ни минеральных. А урожай овощей увеличивается и все они очищены от тяжелых металлов, радионуклидов и пр.

Строки эти не рекламные. Они о том, какое большое значение в развитии сельского хозяйства с помощью красных калифорнийских червей придают американцы. Да и не только они. Даже один из них, Ларри Мартин, лично приехал со своими советами. А мы все раскачиваемся. Научный, можно сказать, прорыв в агрокультуре держится на самоучках-энтузиастах. Государственная служба — Министерство сельского хозяйства, колхозы и совхозы — предпочитают травить землю химикатами, чем снисходить к каким-то там червям. Из-за этого земля наша уже полумертва. Еще не поздно ее возродить.

П. НАГНИБЕДА.

ЭХ, ДАРОГІ!

Сцісні зубы і заплюшчы вочы...

Не наступіў, відаць, яшчэ час, калі ў нас пачнуць будаваць надзейна, прыгожа, словам, для людзей. Пра жыллё часта пішацца, пра яго недахопы, пра пакуты жыльцоў, якія, усяліўшыся ў новую кватэру ці атрымаўшы толькі яе, распачынаюць рамонт. А вось і пра нашы дарогі, іх будаўніцтва варта сказаць колькі слоў. Пра іх, як правіла, пачынаеш думаць, калі едзеш, напрыклад, па аб'язной, што ідзе па паўднёвай ускраіне Івацэвічаў. Па ёй трэба ехаць, сціснуўшы зубы, бо інакш без языка застанешся. Відаць, па той дарозе буйныя чыноўнікі не катаюцца. А лесавозам цягаць тыя хлысты па калдобінах, маўляў, і так добра.

Другі прыклад. Яшчэ некалькі тыдняў таму з Івацэвічаў да Косава можна было ехаць упаўне спакойна, асфальт падрамантавалі, дзе-нідзе і новы паклалі. Але нядаўна ад вёскі Аляксейкі ў бок райцэнтра зноў распачалі рамонт. І на гэты раз які! Палілі смалой асфальт, насыпалі на яго слой шчэбеню і пусцілі каток. Але як ні ўкатвай, а той шчэбень чапляецца за аўтамабільныя колы, ляціць, абівае фарбу, такую шкоду наносіць машынам, асабліва прыватным. Дый дзяржаўнаму транспарту таксама дастаецца нямала. І першае ўжо выбітае лабавое шкло легкавушкі блішчыць асколкамі на тым сыпучым шчэбні.

А як жа веласіпедыстам-дачнікам? Ім застаецца няроўная абочына, па якой не толькі цяжка ехаць, ісці таксама.

— Гэта першыя дні так дрэнна, — кажуць дарожнікі. — А потым укатаецца і не будзе ляцець той шчэбень...

Ляцець, праўда, то не будзе, але ж ужо не тая асфальтаваная гладкая дарога, а камяні ў смале. Дзе, у якой яшчэ краіне знойдзеш такую выдатную (вядома, на думку саміх вынаходнікаў) тэхналогію дарожнага пакрыцця? Думаецца, што ўсё гэта было і працягваецца ад нашай ранейшай і сённяшняй беднасці. Але ж прызнацца ў гэтым "вярхі" не хочуць. Іх статыстыка дае лічбы стабілізаванай эканомікі. А што рэальна, дык гэта — зборы за транспарт з яго ўладальнікаў, з тых арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў, што маюць транспарт, так званы дарожны падатак. Відаць, хутка будзе падатак і на паветра, бо экалагічны ўжо ёсць.

С. РЫГОРАЎ.

СЛУЖБА 01

Жыў у дзядулі шэранькі козлік

На працягу летніх месяцаў у населеных пунктах раёна па віне дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту здарылася 6 пажараў. Усяго ж з пачатку года іх было 19. Вось толькі апошнія жнівеньскія выпадкі.

Пяцігадовы Жэня Мяюшэнка, авалодаўшы запалкамі, падпаліў стажок мінулагодняй саломы на падворку М. Д. Дудзік з в. Азярцо.

Куды большыя страты прычыніў пажар гаспадарцы А. М. Дзямковіча з вёскі Вулька-Целяханская. У грашовым вылічэнні яны складаюць прыблізна 35 млн. рублёў. На сядзібе Аляксея Міхайлавіча згарэў хлеў, а разам з ім у дым і попел ператварыліся дзве тоны сена, загінулі тры казы і дзве свінні. Віноўнік гэтай бяды — унук гаспадара Стас Дзямковіч, якому 8 гадоў.

Хачу звярнуць асаблівую ўвагу настаўнікаў на неабходнасць у ходзе навучальнага школьнага працэсу часцей праводзіць з дзецьмі гутаркі наконт супрацьпажарнай бяспекі, бо толькі агульнымі намаганнямі мы зможам дабіцца станоўчых вынікаў.

В. МОЛАШ,
ст. супрацоўнік ЦНППБ АВПС Івацэвіцкага раёна.

КРЫМІНАЛ

Апетыт у злодзеяў расце

У народзе кажуць, што апетыт прыходзіць у час яды. Так і ў злодзеяў: калі залезлі ў магазін ці склад, то гатовы браць столькі, колькі можна панесці. Падобнае адбылося ў вёсцы Прыбарава Івацэвіцкага раёна.

Невядомы злодзей падабраў такі момант, калі ў вёсцы адключылі часова электрасвятло. Гэтага было дастаткова, каб сарваць замкі на краме (сігналізацыя без электрычнасці, вядома, не працуе) і забрацца ўнутр. Злодзей, па ўсім відаць, быў галодным ці вельмі прагаладаўся, бо браў толькі прадукты і напоі. І не на адзін раз добра паесці запасаўся. Вось мяркуйце самі: 14 палкі каўбасы, 15 пачак сметанковага масла, 14 бляшанак рыбнай кансервы, 17 банак тушонкі, 6 бутэлек гарэлкі... Больш як на два мільёны рублёў. Сапраўды, някепскі апетыт у незнаёмца. Прыкметы яго ўжо вядомыя: гэта мужчына 28-40 гадоў, аброслы твар, барада рыжая, на галаве скамечаная кепка, быў апрануты ў куртку цёмна-зялёнага колеру. Пошукі злодзея працягваюцца. Калі ж хто-небудзь ведае ці бачыў такога чалавека, не заставайцеся абыякавым, хаця б патэлефануйце ў міліцыю, бо заўтра ён можа залезці і ў вашу кватэру.

Калі гаворка зайшла пра апетыт, то варта сказаць і пра злодзеяў іншага кшталту, якіх не цікавяць ні каўбасы, ні гарэлка. Яны, можна сказаць, спецыялізуюцца на навейшай камп'ютэрнай тэхніцы. Спярша такі аматар забраўся ў кантору калгаса "Даманава", у кабінет яго старшыні і сцягнуў тэлефакс японскай вытворчасці коштам 15 мільёнаў рублёў. Залезці ў кантору калгаса для вопытнага злодзея было вельмі проста, бо будынак не ахоўваецца. Як казалі раней, усё вакол калгаснае, усё вакол маё.

Калі калгасную кантору ў Даманаве не ахоўваюць, то ў Даманаўскім вытворча-гандлёвым камбінаце наадварот — там ёсць вартаўнік. Злодзей ці злодзеі, выняўшы аконную шыбіну, аказаліся ў канторы. У кабінет аддзела збыту залезлі, зламаўшы дзверы. Адтуль забралі ўсю камп'ютэрную тэхніку і зніклі. Вартаўнік, праўда, бачыла святло ў акне, нават туды падыходзіла, клікала — хто там? — але ніхто не адгукуся. Камбінату нанесены страты ў суме 50 мільёнаў рублёў.

Тры свежыя выпадкі крадзяжоў. Усе яны пакуль што ў стадыі расследавання. Але ж мы ўпэўнены, што злодзеяў знойдзем, бо многа слядоў пакінулі яны пасля сябе, і схавацца ім ад людскога вока, а тым больш следчага, не ўдасца.

А. ГЛУШЭНЯ,
начальнік крымінальнага вышуку Івацэвіцкага райаддзела міліцыі.

"Газета для вас" **КУПОН** для бясплатнай прыватнай аб'явы

ТЭКСТ
____
____
____
____
____

Прозвішча, імя і адрас (звесткі не публікуюцца):

ПАВАЖАНЫЯ ПАДПІСЧЫКІ!

Гэты купон прызначаецца для бясплатнай прыватнай аб'явы. Яго трэба выразаць, напісаць на ім тэкст сваёй аб'явы ці віншавання і даслаць у рэдакцыю "Газеты для вас". Да віншавання можна прыкласці здымак таго, каго віншуеце. Фота мы таксама надрукуем. Калі тэкст віншавання не змяшчаецца на купоне, яго можна напісаць на асобным лістку.

ПЕДАГОГІКА

● *ЗНАК БЕДЫ*

ТЕЧЕТ В ШКОЛЕ КРЫША...

Помнится, на курсах усовершенствования учителей преподаватель белорусского языка и литературы Микашевичской СШ № 3 В. А. Хилинский восторгался проворотливостью директора их школы.

— Уговорил одного из коммерсантов починить нашу вечно текущую крышу. Тот нашел деньги и сделал дело. И педколлектив, и завхоз вздохнули теперь с облегчением, — рассказывал он.

Богатые люди всегда были склонны к пожертвованиям. Еще в царские времена на их приношения строили театры, музеи, реставрировались церкви, выделялись средства неимущим. Подобное происходит сегодня и в России, где за последние десять лет обнаружилась довольно богатая элита.

Говорить о системности подобных пожертвований в Беларуси не приходится. Но единичные случаи спонсорства, подобные тому, о котором поведал уже упомянутый педагог В. А. Хилинский, отмечаются и в нашем регионе.

Селецкая СШ Березовского района — сравнительно новая школа. Построена в 1981 году. И старожилы школы, и жители деревни помнят, как лихорадочно быстро строилось это здание (а строили, по их словам, солдаты), как спешили к намеченному сроку пустить школу в строй. Трехэтажное здание на фоне этой крупной деревни действительно выглядит внушительно. Только вот болячки, так сказать, той поспешности проявляются всё сильнее и сильнее. Школа накануне учебного года оказалась по сути в аварийном состоянии.

Выпускник Селецкой СШ Николай Степанович Говорко, предприниматель, директор Минской фабрики "Илона", навестив школу, решил хоть чем-то помочь родной школе. Все полы в трехэтажном здании были в одночасье покрыты красивейшим импортным линолеумом.

390 миллионов было вложено в школу предприимчивым земляком.

Но течет крыша. И как итог — вечно мокрая внутренняя стена с первого этажа по третий. Пятно проявляется даже на первом этаже в фойе, как ни закрашивай.

Хотя можно, конечно, повесить на этом месте стенд, спрятать пятно за показатели роста успеваемости. Но от кого, собственно говоря, прятать? От самих себя?

Хроническая нехватка денег сегодня уже не объясняется ни политическими, ни экономическими причинами. Косметический ремонт на выделяемые государством, местными организациями средства еще произвести можно, но привести в надлежащий вид... Где бы ещё сыскать спонсора Селецкой школе, чтобы решить вопрос с крышей? Кто поможет?

А. ГОРБАЧ.

Березовский р-н.

● *ПРАШУ СЛОВА*

Ці ўсё можа класны кіраўнік?

Класнае кіраўніцтва — адна з прычын пастаяннага галоўнага болю настаўніка. Горш за ўсё тое, што ў гэтым трохкутніку (дырэктар-бацькі-класны кіраўнік) апошні — самае слабое звяно і з'яўляецца заўсёды крайнім. Бацькі, якія прыходзяць "жаліцца" дырэктару, думаюць, што настаўнікі-чараўнікі, што яны могуць лёгка ўправіцца з 20-30 вучнямі, хоць самі бацькі часцяком не могуць справіцца са сваім адным дзіцём. А статус настаўніка прымушае яго быць паслухмяным чалавекам, які ніколі не адмаўляецца ад даручанага. А як жа: адмовіцца — значыць распісацца ў сваёй прафесіянальнай непрыгоднасці. Вось і цягне настаўнік гэты воз класнага кіраўніцтва, якое абыходзіцца яму ў 10 ці 20 разоў больш страчаных нерваў, чым каштуе непасрэдна аплата за кіраўніцтва.

Каб не ператварыць класнае кіраўніцтва ў такую ж фармальнасць, як якое-небудзь дзяжурства па школе, неабходна надаць гэтай справе найбольшую ўвагу і аказаць усебаковую падтрымку класнаму кіраўніку. Бо класнага кіраўніка павінна цікавіць не толькі тое, як вучацца дзеці, але і што яны робяць па-за школай, дзе бавяць час вечарам. Ці можа настаўнік, у падпарадкаванні якога бывае за 30 вучняў, усюды паспець?

Р. КАНАЎКА,
просты настаўнік.

● *СОЦИАЛЬНАЯ ЗАЩИТА*

Бесплатное образование в Беларуси: социалистический миф

В Конституции Республики Беларусь указано, что государство гарантирует своим гражданам получение бесплатного начального и среднего образования. Красиво и заманчиво. Но, как и все в неосоциалистическом обществе, данное положение надо трактовать не дословно, а в соответствии с национальными особенностями.

Страшно далеки от народа те, кто утверждает, что в Беларуси существует бесплатное среднее и высшее образование и медицинское обслуживание. В течение последних семи лет в стране сформировался большой "черный рынок" образовательных и медицинских услуг, объем которого составляет, по меньшей мере, 45 процентов от средств, выделяемых официально на данные сферы. Экономика данного поведения субъектов до банального проста. Государство является монополистом на этом сегменте рынка и, соответственно, устанавливает монопольные цены на различные товары и услуги, связанные с образованием и медициной.

В мире существует большое количество передовых технологий организации "производства" среднего образования (ваучерная, подряд в коллективе учителей и т. д.), которые почему-то в Беларуси мало кого интересуют. Чиновники от образования по-старому верят в безусловное превосходство советской педагогической школы, становой хребет которой составляли зомбированные фанатичные учителя, коим очень эффективно внушили идею служения народу, партии, революции — чему угодно, только не себе, не своей семье и близким, — за 130 рублей в месяц. Учителям было обещано многое — после 20—25 лет беззаветного служения и работы на износ.

Да, уровень образования в советской школе во многом был очень высок. Но негативные воздействия того образования еще долго будут сказываться, потому что их искоренение обойдется в огромную сумму и в десятилетия напряженной работы. Это как с атомными электростанциями: получаемая электроэнергия очень дешевая, если не считать расходы на переработку, уничтожение или захоронение радиоактивных отходов.

Исполнителям государство платило за услуги явно ниже, чем они того стоили на рынке. Разницу "снимали" чиновники образовательной вертикали, небольшая очень сплоченная корпоративная группа ученых, которым поручили разрабатывать критерии, оценки и содержание образовательного процесса не столько детей, сколько педагогов.

Все это называлось бесплатной системой среднего и высшего образования. По сути, такой она в Беларуси и остается. Как и с многими другими терминами и понятиями, изменились лишь их "наполнение", содержание.

Особенно магически действует на людей слово "бесплатный". Но "бесплатный" кому, за какие заслуги и какие услуги входят в данное понятие? Каковы механизмы распределения бюджетных средств? Это важнейшие вопросы, без ответа на которые нельзя говорить об эффективной работе данного сектора.

Учебники — одна из составляющих частей организации учебного процесса. Без них невозможно оказание заказываемых государством услуг. По идее, учебники должны входить в пакет "бесплатное среднее образование". Но Совет Министров Беларуси думает иначе. Своим постановлением № 964 от 19 июня 1998 года он установил "порядок взимания платы за пользование учащимися учебниками и учебными пособиями, а также продажи их населению за полную стоимость". При этом принцип бесплатности оказания данной услуги никто не отменял.

Совмин и установил "на 1998/99 учебный год плату за пользование учебниками в размере 25 процентов стоимости комплекта учебников и учебных пособий для учащихся подготовительного, 1-11 (12) классов", а также ввел "их продажу населению за полную стоимость". Дополнительный тираж, который предполагается продавать населению за полную стоимость, составляет 10 процентов от тиража, заказываемого Министерством образования. Отпускная цена "устанавливается исходя из себестоимости и рентабельности издания до 20 процентов", что почти в 2 раза выше среднего уровня рентабельности по стране в целом. В постановлении перечислены категории населения, плата с которых не взимается (школы-интернаты, родители-инвалиды и др.). Кроме того, "плата за пользование учебниками снижается на 50 процентов для семей, в которых воспитываются трое и более детей школьного возраста". Найти в бюджете несколько десятков тысяч долларов на предоставление многодетным семьям права бесплатного пользования учебниками белорусскому руководству, с высоких трибун декларирующему социальные приоритеты своей политики, не представилось возможным.

Что меняет данное постановление в системе стимулов заказчиков (чиновников в сфере образования), исполнителей (конкретных предприятий, выпускающих учебники и получающих под них бюджетные деньги, а также директоров школ и учителей, непосредственно занимающихся распределением учебников), потребителей (учеников и родителей)? Надо понимать, что министр образования (заведующий облоно, гороно, районо) — это далеко не ключевая фигура в иерархии власти. Он — проситель, выбиватель положенных по закону "О бюджете" денег. Но денег на всех и на все явно не хватает, хотя доходная часть бюджета за первое полугодие и перевыполнена. Исходя из имеющихся ресурсов, он размещает заказы на предприятиях-производителях учебников, учебных пособий, дневников, тетрадей и прочих предметов, обеспечивающих учебный процесс.

В этом году некрасиво случилось с дневниками. Министерство решило показать, что оно тоже использует новые технологии и разработало... новый дневник. При этом старых на складах осталось около 500 тысяч. Если даже предположить, что один дневник стоит 0,20 USD, а их использование будет запрещено в новом году, то данное решение чиновников "похоронило" 100 тыс. долларов США. А этих средств с лихвой хватило бы на бесплатные учебники для многодетных семей и многих других слоев населения. За прошлый год в результате несогласованности действий разных ведомств производители заморозили в нереализованной продукции около 100 тыс. долларов США.

Что остается делать потребителям, то есть родителям и детям? Подчиниться существующей монополии и подготовить кошельки на финансирование "бесплатного" образования. Но разве его можно называть бесплатным, если:

— летний и текущий ремонт школ осуществляется часто за счет родителей;

— без дополнительного вознаграждения со стороны родителей некоторые учителя просто игнорируют их детей;

— не хватает средств на разработку новых учебников, на внедрение новых технологий;

— учителя не могут позволить себе обновить гардероб, у них нет свободных средств для подписки на журналы и книги по специальности, а это непременно ведет к снижению качества обучения.

Анализируя такое положение дел в белорусском образовании, можно спрогнозировать, как будет развиваться ситуация с учебниками в свете принятия последнего постановления Совмина. Деньги для типографии на почти бесплатные учебники (по 75 процентов от стоимости) будут поступать с задержкой. Зато на прилавках появятся комплекты для продажи их за полную стоимость. Родители будут вынуждены покупать их за свои кровные, а не за те, которые они уже заплатили в виде налогов. Данные расходы можно назвать дополнительным, скрытым налогом на семьи, в которых есть школьники. Пора принимать закон об избежании внутреннего двойного (а в некоторых случаях — тройного) налогообложения, когда за одну и ту же услугу потребитель платит несколько раз. При этом исполнитель получает только небольшой процент, а основная сумма оседает в карманах государственных посредников.

